**Любоў Канстанцінаўна Тарасюк (1953 – 2006), паэтэса, крытык, літаратуразнаўца**



Нарадзілася 7 снежня 1953 года ў вёсцы Пінкавічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочых. Скончыла з залатым медалём Пінкавіцкую сярэднюю школу імя Якуба Коласа ў 1970 годзе і паступіла на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які закончыла с чырвоным дыпломам ў 1975 годзе. Працягвала вучобу ў аспірантуры (1975-1978), пасля заканчэння якой працавала выкладчыкам. З 1986 г. - дацэнт той жа кафедры. З 1993 г. да верасня 2005 г. працавала на кафедры гісторыі беларускай літаратуры. Выкладала гісторыю беларускай літаратуры XIX - пачатку XX ст. і вусную народную творчасць.

Кандыдат філалагічных навук (1980). Дацэнт (1988). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1981). З’яўлялася сябрам рэдкалегіі часопіса “Маладосць”, а таксама рэспубліканскай Рады Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны. Узначальвала суполку філалагічнага факультэта Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (1991-2005).

Цікавасць да паэтычнага слова ў Л.Тарасюк выявілася рана. Ужо ў 9-10-гадовым узросце складала першыя вершаваныя радкі пра вясну, восень. Упершыню ў друку яе вершы з’явіліся ў 1966 годзе ў газеце “Піянер Беларусі”. Аднак пачаткам літаратурнай дзейнасці паэтэса лічыла 1972 г., калі ў часопісе “Маладосць” была змешчана нізка яе вершаў. Выдала кнігу паэзіі “Смага ракі” (1983). Некалькі прыкметных паэтычных нізак былі змешчаны ў розны час на старонках часопіса “Маладосць” і штотыднёвіка “Літаратура і мастацтва”, каля дваццаці яе вершаў уключаны ў кнігу “Галасы вёснаў” (1997), што выйшла ў серыі “Школьная бібліятэка”, анталогію беларускай паэзіі “Краса і сіла” (2003).

Даследавала паэтыку беларускай літаратуры XIX - пачатку XX ст.

Акрамя гэтага Любоў Тарасюк – вядомы крытык і літаратуразнаўца, аўтар манаграфій “Вернасць вытокам: Фальклорныя традыцыі ў сучаснай беларускай паэзіі” (1985), “Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX - пачатку XX ст.” (1999), навучальнага дапаможніка для школ, ліцэяў, гімназій, ВНУ “Беларуская літаратура: XI - пачатку XIX ст.ст.” (1999; у сааўтарстве). Сваю апошнюю кнігу “Апалогія красы” Л.Тарасюк выдала ў 2003 годзе. У кнізе ўдумлівыя, тонкія назіранні над паэзіяй Н.Арсеньевай, Л.Геніюш, М.Багдановіча, А.Зязюлі, К.Сваяка – паэтаў, хто маліўся Красе.

Памерла 16 чэрвеня 2006 г.

Выток яе жыцця і торчае прычасце – беларускае Палессе, вёска Пінкавічы. Кожны верш Любові Тарасюк напоўнены любоўю да роднай старонкі, павагай да яе працавітых людзей. Вытокі свайго таленту яна бачыла ў радзінных каранях.

Любоў Тарасюк шмат зрабіла для нацыянальнай адукацыі і культуры як асветніца і педагог. За дваццаць пяць гадоў працы ў Беларускім дзяржаўным ўніверсіцеце асабліва шмат часу аддавала стварэнню літаратуразнаўчых навукова-метадычных прац. Яе пяру іх належыць больш за 200.

Творчасць Любы Тарасюк успыхнула ярка і непаўторна, каб у самым росквіце нечакана абарвацца. Яе аднавяскоўцы ганарацца сваей таленавітай зямлячкай і плацяць ей незабыўнай памяццю. У 2010 годзе на доме, дзе яна нарадзілася ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

## Творы Л. К. Тарасюк


1. **Смага** ракі: вершы / Л.Тарасюк. Мінск, 1983. 58 с. (Першая кніга паэта).
2. **Тарасюк, Л.** Вернасць вытокам : Фальклорныя традыцыі ў сучаснай беларускай паэзіі / Л.Тарасюк. Мінск, 1985. – С. 126.
3. **Хацелася** быць пачутымі (Вяртанне паэтычнай класікі) / Л.Тарасюк // Дзень паэзіі-89. Мінск, 1989. –С. 265-271.
4. **“Спакойнай** стомай дыхаюць палі…”; “Бяссоннаю істотай пачуцця…”: [вершы] / Л.Тарасюк // Дзень паэзіі-82 / [уклад. П.Макаль ; рэдкал. : В. Зуенак (гал. Рэд.) і інш.]. Мінск,1982.– С. 211.
5. **Тарасюк, Л.** Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX - пачатку XX ст. : Вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. / Л.Тарасюк. Мінск, 1999. – С. 72.
6. **Тарасюк, Л.** Апалогія красы: кніга пра беларускую паэзію / Л.Тарасюк. Мінск, 2003. – С. 141.
7. **Тарасюк, Л.** “Равнинная полесская душа…” ; “Не отпускай меня, не отпускай” ; “Я все иду непознанной дорогой” / Л.Тарасюк // Белой вежи свет : сборник поэзии Брестчины / сост. і пер. с бел. В. Гришковца. Мінск, 2010.– С. 49-50.
8. **Тарасюк, Л.** “Мой бераг родны…” ; Парашутны шоўк ; Будаўнікі Езуіцкага калегіума ў Пінску. XVII ст. (З цыкла “Маналогі стагоддзяў”) ; Распадаецца сэрца на долі : [вершы] / Л.Тарасюк // Анталогія беларускай паэзіі : у 3-х т. Вершы і паэмы. Мінск, 1993. Т.3 – С. 556-559.
9. **Тарасюк, Л.** Жэня; Да этнагенезу беларусаў ; Воран і голуб ; Не адпускай мяне, не адпускай ; “Яшчэ пад зоркай чысціні…” ; Вавель ; Пілігрымы : [вершы] / Л.Тарасюк // Маладосць. 1991. №2. – С.5-7.
10. **Імя** Айчыны [верш] / Л.Тарасюк // Бел. нива. 2012. 10 февраля.
11. **Тарасюк** Любоў Канстанцінаўна // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў і інш. Мінск, 2002. Т. 15.– С. 439.
12. **Тарасюк** Любоў Канстанцінаўна // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / С.Ф.Самбук ; рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск,1987. Т.5.– С.245.
13. **Тарасюк Любоў** // Літаратурная Берасцейшчына: краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. Мінск, 2008. – С. 59, 270, 274, 276, 303.

14. **Любоў Тарасюк** // Паэтычныя галасы Брэстчыны : Бібліягр. паказальнік у дапамогу настаўніку беларускай мовы і літаратуры пры вывучэнні сучаснай паэзіі і для пазакласнай работы па літаратуры. Брэст, 1991. – С.44-45.
15. **Тарасюк** Любовь Константиновна // Пинская неделя. 1997. 29 августа.
16. **Тарасюк, Л.** Вершы пра каханне //http://www.moykahany.ru/autor/lyuba-tarasyuk
17. **Тарасюк, Л.** // http://twidler.ru/biography/tarasyuk-lyuba
18. **Тарасюк, Люба**. Биография //http://slovo.ws/bio/bel/17/0006.html
19. **Беларуская** паэзія на Вашых далонях. Тарасюк Люба. Біяграфія //http://allpoet.ru/bel/author/53/0/index.php
20. **Беларускія** вершы. Люба Тарасюк //http://www.vershy.ru/category/lyuba-tarasyuk
21. **Вершы пра Беларусь** //http://www.vershy.ru/category/lyuba-tarasyuk
22.**Люба Тарасюк** (нар. у 1953 годзе) // Літаратурная карта Берасцэйшчыны / укладальнік А. Крэйдзіч. – С. 485—487.. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2008.
23. **Тарасюк, Л.** “Свет и мрак в упрямой схватке…” [Символизм в белорусской поэзии XX века] / Любовь Тарасюк // Неман.–2002 (№ 34).– С. 232–243.
24. **Тарасюк, Л.** Імпрэсіянізм у беларускай літаратуры // Роднае слова.–2001 (№ 4).– С. 12–15.
25**.ТАРАСЮК, Л. К.** Адметнасць : Творчасць Янкі Лучыны // РОДНАЕ СЛОВА. – 2001.–N 7.–С.56–58.
26.**ТАРАСЮК, Л. К**. Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя. (Аглядавая тэма у школе, XI клас) / Л.К. Тарасюк // БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА. – 2002.–N 1.–С.28–36.
27.**Тарасюк, Л. К.** Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя : [ мастацкая канцэпцыя кнігі М. Багдановіча "Вянок" ] / Любоу Тарасюк // БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА. – 2006.–8.– С.6–18
28. **Тарасюк, Л. К.** Мастацкія кірункі і плыні ў літаратуры Беларусі 19 стагоддзя : [два тыпы рамантызму:Адам Міцкевіч і Ян Баршчэўскі ] / Любоу Канстанцінауна Тарасюк // БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА. – 2006.– С.33–42

## Аб жыцці і творчасці Л. К. Тарасюк

29. **Гарэлік, Л.М.** Тарасюк Любоў / Л.М.Гарэлік // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т. / Ін-т імя Я.Купалы АН Рэспублікі Беларусь. Беларус. Энцыкл. ; пад рэд. А. В. Мальдзіса. Мінск, 1995. Т. 6. – С.67–68.
30. **Тарасюк** Любоў Канстанцінаўна // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003. С.491–492.
31. **Тарасюк** Любоў Канстанцінаўна // Ученые Пинщины : [справ. издание] / авт.–сост. И. А. Кибак, П. Н. Синкевич. Минск, 2003. – С.110

32. **Памяці** Любы Тарасюк (1953-2006); Пра Любу… ; Публікацыі Любы Тарасюк // Працы кафедры гісторыі беларускае літаратуры Белдзяржуніверсітэта : навуковы зборнік / пад агульн. рэд. М. Хаўстовіча. Мінск : ВТАА "Права і эканоміка", 2006. Выпуск сёмы. – С.3–22.
33. **Скобла, М.** Люба Тарасюк : [памяці паэтэсы, выкладчыка] / Міхась Скобла // Наша ніва. 2006. 21 ліп.
34. **Булгаков, В.** История белорусского национализма : Памяти Любы Тарасюк (1953-2006) / Валер Булгаков. Вильнюс : Институт белорусистики, 2006. – С. 331.
35. **Гришковец, В.** Она воспевала эту землю : [об открытие мемориальной доски Л. Тарасюк в д. Пинковичи] / Валерий Гришковец // Заря. 2010. 11 декабря.– С.10.
36. **Гришковец, В.** Она восславила эту землю… : [открытие мемориальной доски Л.Тарасюк] / Валерий Гришковец // Пінскі веснік. 2010. 10 снежня.
37. **В Пинковичах** открыли мемориальную доску, посвященную местной уроженке Любови Константиновне Тарасюк // Полесская правда. 2010. 15 декабря.
38. **Гришковец, В.** "Мой бераг родны…" : [о поэтэссе Любови Тарасюк] **/** Валерий Гришковец // Пінскі вестнік. 2009. 27 лістапада.
39. **Бельскі, А.** Паўнаводная рака творчасці : Літаратурны і навуковы плён Любові Тарасюк / Алесь Бельскі // Роднае слова. 2003. №12.– С.11–14.
40. **Гук, У.** "Я любові тваёй галінка…" : [аб паэзіі Любы Тарасюк] / Уладзімір Гук // Пинская неделя. 1999. 9 апреля.
41. **Бондар, Т.** "Пра ўсё сказаць прыйшла пара…" : Маладая беларуская паэзія, год 1983. Літаратурны агляд [аб паэзіі Любы Тарасюк] / Таіса Бондар // Маладосць. 1984. №3. – С.160–166.
42. **Гарадніцкая, Я.** Вяртанне ў працяг / Я.Гарадніцкая // ЛіМ. 1983. 28 кастрычніка.
43.**Мажароўская, С.** Гонар Пінкавіцкай зямлі / Святлана Мажароўская // Полесская правда.–22 декабря (№ 102).– С. 12..–Пінск, 2018.
44. **Мажароўская, С.** Родны бераг Любові Тарасюк / Святлана Мажароўская // Рэспубліка. – 1 снежня (№ 227). — С. 16.. - Минск, 2018
45. **Бельскі, А. І.** "Гэты ранак мяне паклікаў…" слова пра Любоў Тарасюк / Алесь Бельскі // Дзеяслоў.– 2018.– № 4.– С. 243–247.